Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

16 чэрвеня 2016 года, № 9 (2156)



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Маладыя супрацоўнікі радуюцца пасведчанням дзяржаўнага ўзору разам з прарэктарам БДУ Аляксеем Данільчанкам*

## У нумары:


АД РУКАПІСУ ДА ТЫРАЖУ
Гутарка з начальнікам УРВР Наталляй ГЕРАСІМОВІЧ пра стварэнне вучэбных і навуковых выданняў БДУ
*Стар. 2*

«МДЭІ ВЕДАЮЦЬ У СВЕЦЕ»
Размова з дырэктарам МДЭІ імя Сахарава Сяргеем МАСКЕВІЧАМ пра сучасную экалагічную адукацыю
*Стар. 3*

ВЯЗЫНКА–2016: ФЕЕРЫЯ ПАЭЗІІ І МАЛАДОСЦІ
Сёлета на радзіме Янкі Купалы прайшоў асаблівы злёт студэнтаў БДУ
*Стар. 4*


ШКОЛА ЛІДАРА

# Моладзі – перспектывы!

Адмысловую праграму павышэння кваліфікацыі «Усе трэнды сучаснага лідара», якая разгортвалася з 24 мая па 8 чэрвеня, завяршылі 70 супрацоўнікаў універсітэта.

Першая школа лідара праходзіла ў чэрвені 2013 года, але сёлета на курсы набралі не толькі прафесарска-выкладчыцкі склад, але і прадстаўнікоў структурных падраздзяленняў. Далучыліся супрацоўнікі медыяцэнтра, фундаментальнай бібліятэкі, цэнтра інфармацыйных тэхналогій, Галоўнага ўпраўлення эканамічнай і інвестыцыйнай дзейнасці, упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю і інш.

Слухачы або складаюць так званы «кадравы рэзерв», або толькі рэкамендаваныя туды як перспектыўныя супрацоўнікі. То бок яны могуць у любы момант заняць кіраўнічыя пасады ва ўніверсітэце. Таму ўпраўленне кадраў БДУ на базе ФМА зладзіла спецыяльную школу, каб падрыхтаваць будучых лідараў, дапамагчы ім цікава і незвычайна павысіць кваліфікацыю.

Адукацыяй слухачоў займаліся знакамітыя ў прафесійных колах бізнес-трэнеры, топ-менеджары беларускіх кампаній і выкладчыкі БДУ. Майстар-клас «Кіраванне праектамі», для прыкладу, вёў **Сяргей Гарэлік,** намеснік дырэктара па развіцці і кіраванні праектамі групы кампаній «А-100», інтэрактыўны семінар «Эфектыўная работа і ўзаемадзеянне ў камандзе» – **Міхаіл Лях,** сертыфікаваны трэнер Міжнароднай асацыяцыі коўчаў, практыкум «Іерархія лідарскіх стыляў і рыс характару» – **Алег Радзюк,** дацэнт кафедры агульнай і клінічнай псіхалогіі БДУ – усяго каля дзесяці чалавек.

Карэспандэнт газеты «Універсітэт» паназіраў за завяршэннем праграмы. У 9 гадзін раніцы 8 чэрвеня пачаўся заключны семінар «Прыцягненне персаналу» **Сяргея Прыходзькі,** дырэктара па рабоце з персаналам ЗАТ «Альфа-Банк». За партамі сядзелі па большасці слухачкі. Мужчын па самым аптымістычным падліку недзе каля чвэрці. Цікава, няўжо кіраванне ўніверсітэтам у будучыні адыдзе прыгожай палове? Пакуль сярод дэканаў факультэтаў няма аніводнай жанчыны.

На працягу семінара Сяргей Прыходзька распавядаў, чым адрозніваецца работнік ад супрацоўніка і як зрабіць, каб людзі прынялі місію кампаніі як сваю асабістую. Таксама выкладчык спыніўся на рысах, па якіх можна яшчэ на этапе сумоўя выявіць незацікаўленага супрацоўніка, і шмат яшчэ на чым іншым. Семінар працягваўся болей за гадзіну. Напрыканцы слухачы задавалі разнастайныя пытанні.

Удзельнікі курсаў хадзілі на заняткі з 24 мая, два тыдні, адначасова працавалі на сваіх асноўных месцах працы. Цяпер ім засталося пайсці ва ўніверсітэцкі дворык, там арганізуюць флэш-моб і атрымаюць свае пасведчанні дзяржаўнага ўзору.

Праграма курсаў павышэння кваліфікацыі складалася з прыцэлам на «навучанне дзеяннем». Гэта досыць нестандартны падыход да адукацыі. Удзельнікі спачатку прайшлі анкетаванне, каб выявіць свае лідарскія здольнасці. Заняткі былі максімальна нефармальнымі, нязмушанымі. Слухачы прайшлі камунікатыўную гульню, прысутнічалі на аглядзе праграмнага забеспячэння. Карацей, атрымаўся гэткі «адукацыйны мадэрн». Рыхтавалі будучых кіраўнікоў па такіх напрамках, як базавыя навыкі кіравання, дзелавыя камунікацыі кіраўніка, дэлегаванне паўнамоцтваў і размеркаванне адказнасці, прыняцце кіраўнічых рашэнняў, камандная праца, эмацыйны інтэлект.

***Марыка Баранава,*** выкладчык рускай мовы як замежнай, ФМА: «Мне падаецца, што крэатыўная адукацыя – гэта цікава і карысна. Людзі стамляюцца на працы. Ім хочацца вучыцца чамусьці новаму. Асабліва спадабалася тое, што некаторыя выкладчыкі ўдзельнічалі ў рэальных праектах. І яны дзеляцца з намі рэальным вопытам, распавядаюць пра рэальныя кампаніі, пра тыя праекты, стартапы, якія яны рабілі».

***Дзмітрый Марушка,*** загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі, ЭФ: «Асабліва хочацца адзначыць майстар-клас «Кіраванне праектамі» (**Сяргей Гарэлік** – *заўв. рэд.*) і «Базавыя навыкі кіравання» (**Дзмітрый Лук'янаў,** дацэнт кафедры агульнай і клінічнай псіхалогіі БДУ – *заўв. рэд.*). Менавіта гэтыя выкладчыкі, на мой погляд, праявілі максімальны ўзровень крэатыўнасці. Яны імкнуліся ўцягнуць усіх слухачоў у навучальны працэс. Нарэшце, у іх атрымалася пабудаваць міжасабовую камунікацыю, стаць нам бліжэйшымі адзін да аднаго. Хочацца адзначыць нязмушаную форму выкладання. Досыць складаны матэрыял падавалі простай мовай. Лекцыі былі жывыя, практыка-арыентаваныя, і назіралася максімальная зацікаўленасць слухачоў».

Флэш-моб ва ўніверсітэцкім дворыку ўяўляў сабой фітнэс-танец «Зумба», які прафесійна правяла выкладчык ФМА **Вольга Шыманская**. Спачатку смешна было глядзець, як выкладчыкі, загадчыкі кафедраў танчаць з сур'ёзнымі тварамі, імкнучыся запомніць парадак рухаў. Але потым у іх пачало атрымлівацца, твары сталі менш заклапочаныя, а рухі неблагія і больш-менш сінхронныя. Арыгінальны спосаб завяршаць курсы, тым больш што слухачы ў асноўным не старэйшыя за 35 гадоў. А ад кіраўніцтва ўніверсітэта сказаць добрыя словы прыйшоў ***Аляксей Данільчанка,*** прарэктар па вучэбнай рабоце: «Віншую з заканчэннем школы лідара. Спадзяюся, што атрыманыя веды вы зможаце выкарыстаць на практыцы ў сваіх калектывах, што вы будзеце сапраўды ініцыятыўнымі, крэатыўнымі, прыгожымі лідарамі. Вы наш гонар. Мы робім стаўку на моладзь і чакаем ад вас аддачы, каб наш універсітэт прасоўваўся ў міжнародных рэйтынгах і каб усе ведалі, што БДУ — найлепшая ВНУ краіны!»

**Віталь АРЭШКА**

## Весткі з рэктарата

**БОЛЬШ** за 30 распрацовак прадставіў БДУ на Міжнароднай выставе «Белагра–2016» у межах III Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Тэхналогія біяфізічнай перадпасяўной мікрахвалевай апрацоўкі насення сельскагаспадарчых і лекавых культур выкарыстоўваецца шэрагам гаспадарак і прадпрыемстваў Беларусі. Распрацаванае ў ***НДІ ядзерных праблем*** ЗВЧ-абсталяванне забяспечвае апрацоўку да 1000 кг насення ў гадзіну. Аналагаў такой тэхналогіі ў Расіі і краінах СНД не існуе. ***НДІ ФХП*** прадставіў комплекс антысептычных сродкаў новага пакалення, прызначаных для дэзінфекцыі на прадпрыемствах харчовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, які вызначаецца мінімальна негатыўным уплывам на экалогію, жывёл і чалавека.

Удзел у выставе «Белагра–2016» прынялі больш за 500 кампаній з 23 краін.

* * *

**КАМБІНАТ** грамадскага харчавання БДУ атрымаў дыплом 1 ступені ў намінацыі «Найлепшы аб'ект грамадскага харчавання пры ўстанове вышэйшай адукацыі». Такое рашэнне прыняла рэспубліканская камісія, у якую ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства гандлю, Міністэрства адукацыі і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

* * *

**ПРАТАКОЛ** аб намерах падпісаны 25 мая паміж БДУ і фінансава-прамысловай кампаніяй «Космас – Нафта – Газ» (Расія) падчас працы 5-й Міжнароднай выставы інавацый і тэхналогій INOTEX–2016 (г. Тэгеран, Іран). Расійскі бок выявіў зацікаўленасць у супрацоўніцтве з БДУ ў галіне прыбораў і абсталявання для нафтахіміі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Ад рукапісу да тыражу

**Пятнаццаць гадоў адзначыла ў чэрвені ўпраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы.** Пра асноўную задачу гэтай структуры – стварэнне арыгінал-макетаў вучэбных і навуковых выданняў БДУ, пра штодзённыя клопаты і святочныя радасці мы пагутарылі з начальнікам УРВР Наталляй ГЕРАСІМОВІЧ.

***– Ва ўмовах эканамічнага крызісу, які ўдарыў і па кнігавыдавецкай справе, што змянілася ў рабоце УРВР? Ці стала менш кніг вышэйшай якасці?***

– Якасць заўсёды аднолькавая. Мы дасканала рыхтуем тое, што выдаём. Але цяпер больш уважліва разглядаюцца праекты планаў да выдання. Наколькі запланаванае неабходна для навучальнага працэсу, колькі студэнтаў рыхтуюць па дадзеным кірунку, што ўжо выдадзена па гэтай дысцыпліне… Такім чынам колькасць выданняў памяншаецца. З'явілася і альтэрнатыва традыцыйнай кнізе – электроннае выданне. Грошай на яго падрыхтоўку трэба менш, прытым гэта таксама якасна падрыхтаваны дапаможнік, з грыфам. Між іншым, усе нашы папяровыя выданні маюць электронныя версіі, якія мы ў вызначаным парадку штомесяц перадаём у Электронную бібліятэку БДУ.

***– Як ацэньваецца кніжная прадукцыя БДУ па-за межамі ўніверсітэта?***

– Часта нашы кнігі адзначаюцца граматамі на Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі», а два выданні ўзялі дыплом першай ступені. У 2013 г. пераможцам стаў дапаможнік па англійскай мове, а сёлета навучальны дапаможнік Deutsch прызнаны найлепшым у намінацыі «Падручнік новага стагоддзя». Здаецца, журы аддае перавагу еўрапейскай вёрстцы, афармленню і напаўненню – а гэтым якраз вылучаецца літаратура на замежных мовах. Прадстаўлялі мы нашы кнігі і на прасторы СНД, напрыклад, на конкурсах «Універсітэцкая кніга Еўразіі» (2015 г.), «Універсітэцкая кніга – 2014: сацыяльна-гуманітарныя навукі» (Казань), там многія выданні БДУ былі адзначаны дыпломамі. Прыемна, што наша ўніверсітэцкая кніга на фоне літаратуры з усёй СНД выглядае вельмі годна, і па якасці, і па разнастайнасці.

## Зроблена ў СССР

Літаратура БДУ на рускай і беларускай мовах, здаецца, больш адпавядае таму, як было прынята бачыць падручнік за савецкім часам.

Пра нашу кнігу можна сказаць: «Зроблена ў СССР». Значыць, зроблена якасна, добрасумленна. Значыць, кожны спецыяліст са свайго боку адпрацаваў кнігу. Усе коскі, усе старонкі на сваіх месцах…

Бывае, аўтар прыходзіць з рукапісам і здзіўляецца – маўляў, ну што тут яшчэ рабіць, я ўжо ўсё вычытаў, трэба друкаваць. Аўтар звычайна не здагадваецца, які вытворчы цыкл павінен прайсці яго твор, каб на выхадзе атрымалася якаснае выданне. Бывае вельмі крыўдна разгарнуць кнігу вядомага аўтара – і пабачыць элементарныя памылкі, якія з'явіліся там не таму, што аўтар непісьменны, а таму, што людзі, адказныя за падрыхтоўку кнігі, не зрабілі яе як належыць. Скарысталі знакамітае імя, патрэбу мець выданне пэўнага кірунку – і зарабілі грошай, не прыклаўшы асаблівага намагання, каб кнігу адрэдагаваць.

## Выйсці ў тыраж

***– А што ўяўляе сабой цыкл падрыхтоўкі кнігі – ад аўтарскай задумы да здачы ў тыраж?***

– Працэс выдання кніг павінен быць упарадкаваны, адладжаны. Каб не атрымалася, што сёння ў нас няма над чым працаваць, а назаўтра ўсе адразу прыбягуць з рукапісамі.




Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Наталля Герасімовіч (злева) і калегі: Таццяна Белапко, Наталля Акуліч, Надзея Анікеенка (намеснік начальніка), Таццяна Петрачэнка*

Зрэшты, і такое здараецца… Але ў рэдакцыйраў заўсёды мусіць быць праца, для гэтага ствараецца так званы рэдакцыйны партфель. Існуе план выдання на год – ён разглядаецца на Рэдакцыйна-выдавецкім савеце БДУ, зацвярджаецца рэктарам. Аўтары, якім пашчасціла трапіць у Перспектыўны план, прадстаўляюць ва УРВР свае рукапісы з абавязковым камплектам дакументаў як сведчанне, што аўтарскі арыгінал разглядаўся на кафедры і на факультэце, што на рукапіс маюцца рэцэнзіі спецыялістаў у адпаведнай галіне, прытым не з БДУ. Вучэбнаму выданню абавязкова патрэбна рэцэнзія адпаведнай кафедры і грыф – усе выданні вучэбнага кірунку ў БДУ выходзяць толькі з грыфам Міністэрства адукацыі або вучэбна-метадычнага аб'яднання па сваім кірунку. Гэта знак якасці – рукапіс кампетэнтнымі ўстановамі рэкамендаваны да выкарыстання ў навучальным працэсе розных ВНУ.

Усе такія аўтарскія арыгіналы з патрэбнымі дакументамі мы збіраем, разглядаем, складаем праект плана. Тыраж фарміруем з улікам запытаў нашай бібліятэкі, якая па факультэтах высвятляе патрэбу ў тым ці іншым выданні. Які планаваць аб'ём выдання, вырашаецца з дапамогай Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы, дзе высвятляецца, якая колькасць гадзін на якую дысцыпліну адведзена. Вядома, не можа быць кніга ў 500 старонак, калі дысцыпліна прадугледжвае мала гадзін. Тэхнічны рэдактар вызначае колькасць старонак адпаведна тэхнічным патрабаванням – каб атрымліваліся пэўныя сшыткі ўнутры кнігі. Затым выстаўляюцца такія параметры, як фармат, каляровасць. Потым кнігу вычытваюць рэдактар, карэктар, праглядаюць тэхнічны і мастацкі рэдактары, нарэшце адбываецца вёрстка. Усе гэтыя працэсы могуць шматкроць паўтарацца, з унясеннем правак ледзь не да поўнага перапісання аўтарам свайго твора. Бо часам, пакуль аўтар уносіць праўкі рэдактараў, яму хочацца нешта перарабіць, прыходзіць нейкая ідэя – і потым перад рэдактарам фактычна новы тэкст. А колькі на вёрстцы ўсяго пабачыш… Няма межаў удасканаленню, і гэта вельмі цікавы працэс.

## «Проста так грошы БДУ не трацім»

Ёсць кнігі, якія ў чорна-белым выкананні не маюць сэнсу: выданні з картамі, касмічнымі здымкамі і г. д. Каляровасць патрабуе дадатковых сродкаў. Штогод выходзяць святочныя выданні – да юбілею кафедры, факультэта, універсітэта, якія прадугледжваюць крэйдаваную паперу, вялікую колькасць фотаздымкаў, нестандартны фармат. Бывае, наш мастак забракоўвае большасць прадстаўленых фотаздымкаў як непрыдатныя для паліграфічнага выканання, даводзіцца пераздымаць. Усё гэта зацягвае працэс падрыхтоўкі такіх выданняў. Шмат залежыць ад таго, наколькі імпэтна працуюць адказныя за кнігу – ёсць такія, што ўсё хутка пераробяць, мы з імі працуем камандай; трапляюцца і такія, якія лічаць, што лепей ведаюць, як нам рабіць нашу працу… У любым выпадку, проста так грошы БДУ не трацім. Мы падыходзім да выдаткаў разумна і з папярэднім аналізам.

***– Ці рыхтуюцца зараз адмысловыя выданні да юбілею БДУ?***

– Так, у серыі «Памяць і слава», прысвечанай асобам БДУ, значным для ўсёй беларускай навукі, сёлета выйшла кніга «Л. М. Шакун. Да 90-годдзя з дня нараджэння». Рыхтуецца і яшчэ адно падобнае выданне. Упершыню прадставім літаратурна-мастацкае выданне «Кветкавыя ветразі», змест якога складуць вершы сяброў клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа» БДУ, гэта праект фундаментальнай бібліятэкі. Думаю, атрымаецца цікавая кніга пра дынастыі вучоных БДУ – яшчэ адзін падарунак да юбілею альма-матар.

## Моўнае пытанне

***– Надоечы УРВР падрыхтавала надзвычай цікавы слоўнік-мінімум лінгвістычнай тэрміналогіі на рускай, беларускай і кітайскай мовах. Як робяцца падобныя, іншамоўныя і шматмоўныя, выданні? Хто іх карэктуе?***

– На кітайскай мове часта рыхтуюцца кнігі. У такіх выпадках уся надзея на аўтарскі калектыў, бо ў нас няма спецыялістаў, каб рэдагаваць і карэктаваць такія выданні. Мы займаемся іх тэхнічным афармленнем – скажам, каб практыкаванні былі аформлены ў адным ключы, каб пераліс стаялі ўсе з аднолькавымі «зорачкамі», а не абы-як.

## На прастор, на шырокі прастор

***– У навуковых часопісах «Веснік БДУ» і «Сацыялогія», за выпуск якіх адказвае УРВР, таксама наспявае патрэба ў «іншамоўных» спецыялістах – апошнія рэкамендацыі для гэтых выданняў прадугледжваюць шырэйшае выкарыстанне англійскай мовы, стварэнне англамоўнай версіі сайта… Хто тут будзе займацца рэдактурай і карэктурай?***

– Як будзе наладжана праца ў гэтым рэчышчы, пакуль дакладна не ведаю. Але мяркую, што многія аўтары і іх рэцэнзенты добра ведаюць англійскую мову, з улікам спецыфікі сваёй галіны навукі. Вялікая роля рэдкалегій, якія могуць мець аднаго англамоўнага спецыяліста… Пра гэта трэба гаварыць і думаць. Бо сёння часта маем фармальны, літаральны пераклад рускай або беларускай анатацыі на англійскую мову. Але ж англамоўная анатацыя вельмі важная: калі ў ёй замежны навуковец знойдзе тое, што яму трэба, то можа заказаць пераклад усяго артыкула. Таму англамоўная анатацыя павінна быць значна большага аб'ёму, чым сёння; у ёй павінна быць пэўная структура. А хто яе павінен рабіць – тут трэба абмяркоўваць, вырашаць супольна. З таго часу, як пастаўлена задача павысіць міжнародны рэйтынг нашых навуковых часопісаў, у аддзела навуковых перыядычных выданняў значна дадалося працы. Трэба ўлічваць міжнародныя выдавецкія стандарты. Адно руплівае афармленне бібліяграфічных спасылак чаго вартае! Бывае, не разбярэш, дзе заканчваецца назва часопіса і пачынаецца назва артыкула, на якія спаслаўся аўтар. Рэдактару даводзіцца разбірацца, шукаць у інтэрнэце, зацвярджаць праўкі з аўтарам, а тых аўтараў вялікая колькасць… Задача ўступіць у Scopus або Web of Science сур'ёзная, патрабуе ўдумлівага аналізу: а што мы, уласна, друкуем у нашых часопісах? Якаснае напаўненне артыкула не выправіш «міжнародным» афармленнем. Некаторыя аўтары кажуць – вой, ды я зляпіў артыкул за вечар. Гэта крыўдна, гэта зневажае. А яшчэ нашым часопісам пільна патрэбна рэцэнзаванне, пажадана сляпое. Рэцэнзіі, якія прыносяць аўтары – цудоўна, але мы ведаем, як яны пішуцца, часам самімі аўтарамі. Не, часопіс павінен адпраўляць артыкулы, якія плануюцца ў нумар, на рэцэнзію спецыялістам у адпаведных сферах. Ёсць рэцэнзаванне – ёсць навуковы часопіс. Гэта доўгі шлях, але ён пасільны, калі будзе жаданне абодвух бакоў, і аўтараў, і рэдкалегіі. А мы, УРВР, толькі выканаўцы.

## Кадры рашаюць

Задача УРВР – якасная падрыхтоўка арыгінал-макета, які потым, стаўшы кнігай, будзе служыць студэнтам, прытым не толькі ў БДУ. Мы робім макет з таго, што нам прадставілі. Але нашы супрацоўнікі не раўнадушныя да таго, што робяць. Не проста заганяюць артыкул ці кнігу ў фармальныя рамкі, а сапраўды цікавяцца, задаюць аўтарам пытанні, калі бачаць, што нешта не стыкуецца.

***– Гонар упраўлення складаюць, вядома, заслужаныя работнікі. А як з маладымі? Калі падбіраеце рэдактараў, якія якасці найперш улічваеце? Ці можна «давыхаваць» рэдактара ў працэсе работы?***

– Рэдактара выхаваць складана. Лічу: або чалавеку дадзена бачыць тэкст, адразу ўвесь, і разумець, што ў ім не так ці што можа быць палепшана, або гэтага не дадзена. Калі падбіраю рэдактараў, вызначальным бывае, ці можа кандыдат рэдагаваць тэксты на беларускай мове, ці заўважае «злёту» непатрэбныя словы, нагрувашчванні і вялегурыстасці, якія часта вылучаюць псеўданавуковы стыль, ці можа выправіць шматлікія паўторы, ці бачыць структуру главы, артыкула, усёй кнігі. Яшчэ важна, каб чалавек быў ветлівы, уважлівы, уседлівы, руплівы – усё гэта бачна на першым жа сумоўі.

***– Ці маецца «цякучка» кадраў?***

– Ёсць людзі, якія вельмі доўга працуюць у нашым упраўленні. А моладзь, адпрацаваўшы два гады, сыходзіць шукаць вялікія заробкі. Як правіла, рэдка хто знаходзіць… Былі выпадкі, калі людзі, сышоўшы, праз некаторы час вярталіся да нас – гэта прыемна. Значыць, у нас ёсць нейкая стабільнасць. Бо і сама паспрабавала працаваць у іншым выдавецтве – але мне спадабалася, што ў БДУ якасці работы, якасці кнігі надаецца такая вялікая ўвага.

***– УРВР налічвае каля 40 чалавек – ці робяцца нейкія захады, каб здружыць супрацоўнікаў? Зразумела, у сяброўскай супольнасці лепей працуецца…***

– Мы заўсёды ўсе дні народзін адзначаем разам. Купляем для імянінніка торт, цукеркі і невялічкі падарунак, ладзім гарбату. Натуральна, святы з'ядноўваюць. Нядаўняе святкаванне юбілею нашага ўпраўлення аб'яднала ўсіх – нават тых, хто спярша не дужа хацеў «аб'ядноўвацца». У нас атрымалася сяброўская сустрэча, падчас якой кожны супрацоўнік атрымаў сваю арыгінальную падзяку. Людзі розныя, людзі цікавыя, добрасумленныя і, да таго, з пачуццём гумару – без яго рэдактару немагчыма.

Гутарыла
Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

# МДЭІ ведаюць у свеце

**Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут (МДЭІ) імя Сахарава, які ўваходзіць у склад БДУ,** адрозніваецца асабліва цесным супрацоўніцтвам са шматлікімі замежнымі ўніверсітэтамі, працай у замежных праектах і праграмах.

Свой міжнародны статус інстытут падцвердзіў яшчэ раз, выступаючы ўдзельнікам і каардынатарам праграмы Tempus EcoBRU. У дырэктара МДЭІ **Сяргея МАСКЕВІЧА** мы даведаліся, якія сёння задачы ставіць перад сабой інстытут у пытаннях экалагічнай адукацыі і як рыхтуе студэнтаў да працы па спецыяльнасці.

***– Сяргей Аляксандравіч, што такое Tempus EcoBRU?***

– Гэта навуковы праект, асноўная мэта якога заключаецца ў распрацоўцы і рэалізацыі адукацыйных праграм у сферы экалагічнай адукацыі для настаўнікаў і выкладчыкаў ВНУ Беларусі, Расіі і Украіны. З ініцыятывай арганізацыі гэтай праграмы выступілі нямецкія калегі. І вось ужо на працягу трох гадоў мы сустракаемся і абмяркоўваем прапановы па фарміраванні экалагічных кампетэнцый спецыялістаў пасродкам дыстанцыйнага навучання. Праект адзін. Праграмы розныя. На апошняй сустрэчы кожнай краінай былі прадстаўлены розныя праекты, Беларусь разам са сваімі партнёрамі – Украінай і Расіяй – прэзентавала свой.

Наступным крокам праекта EcoBRU стане падтрымка сістэмы мабільнасці выкладчыкаў ВНУ і настаўнікаў школ. Тут важна запусціць механізм сеткавага ўзаемадзеяння ўсіх партнёраў па праекце для эфектыўнай дзейнасці выкладчыкаў ў галіне экалагічнай адукацыі.

***– У чым жа сутнасць праекта EcoBRU «Экалагічная адукацыя для Беларусі, Расіі і Украіны»?***

– Праект вельмі актуальны, тут



*Сяргей Маскевіч*

многа ўдзельнікаў, таму патрабуецца доўгая і напружаная праца. Спачатку трэба было зразумець, на якім узроўні знаходзіцца экалагічная адукацыя педагогаў. Потым распрацаваць праграмы, асноўная мэта якіх фарміраванне экалагічных кампетэнцый выкладчыкаў. І самае галоўнае – прадумаць, як яе рэалізаваць.

Рэалізацыя пастаўленых задач магчыма праз сістэму павышэння кваліфікацыі, якая існуе, але ў дыстанцыйнай форме. Вось гэта і складае прадмет праекта, калі навукоўцы-экологі з розных краін ў межах праекта наведваюць ВНУ, знаёмяцца з прапановамі праграм па дыстанцыйным навучанні, спрабуюць зразумець, якія курсы могуць быць самымі лепшымі.

Удзельнікі праекта «Экалагічная адукацыя для Беларусі, Расіі і Украіны» пастаянна сустракаюцца. Толькі за гэты навучальны год яны чатыры разы збіраліся, абменьваліся думкамі, знаёміліся з напрацоўкамі і слухалі даклады. Сустрэчы праходзілі ў Германіі, Украіне, зараз праходзяць у Беларусі.

***– Што прапанавалі сахараўскія спецыялісты?***

– Мы распрацавалі курсы для педагогаў павышэння кваліфікацыі ў галіне экалагічнай адукацыі. Іх пратэсціравалі, запрасіўшы з Мінска і Мінскай вобласці настаўнікаў і выкладчыў, зацікаўленых у гэтым эксперыменце. Той, хто вядзе адпаведныя прадметы ў школе (напрыклад біялогію), працуе ў інстытутах развіцця адукацыі, пазнаёміўся з нашымі курсамі, якія распрацавалі канкрэтна прафесары нашага інстытута.

Дарэчы, водгукі былі толькі станоўчыя. Зараз мы актыўна працуем над тым, каб гэтыя курсы дыстанцыйнага навучання сталі часткай праграм павышэння кваліфікацыі, якія праводзяць у нас Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, рэгіянальныя цэнтры развіцця адукацыі. Туды будуць перададзены нашы распрацоўкі, якімі яны змогуць карыстацца і супрацоўнічаць з аўтарамі па ўдасканаленні іх курсаў. Праз гэты механізм, які пачаў працаваць па ўсёй Еўропе, сапраўды можна зрабіць вельмі і вельмі многае ў развіцці экалагічнай адукацыі, у фарміраванні экалагічных кампетэнцый.

***– У Сахараўскага інстытута шмат замежных партнёраў. Ці праходзяць выкладчыкі і студэнты стажыроўку за мяжой?***

– Так, нашых выкладчыкаў і студэнтаў добра ведаюць за мяжой. Бо партнёраў у нас сапраўды многа. І праграма Tempus адна са шматлікіх. У рамках дадзенай праграмы ў інстытуце рэалізуецца таксама праект «Бяспека чалавека (ахова навакольнага асяроддзя, кантроль якасці прадуктаў харчавання, ахова здароўя, сацыяльна-прававая абарона) на тэрыторыях, пацярпелых ад радыяктыўнага забруджвання». Наладжана супрацоўніцтва з рознымі краінамі: Нарвегія, Германія, ЗША, Італія, Сербія, Балгарыя, Польшча, Іспанія, Арменія, Швецыя, Іран, Індыя, Расійская Федэрацыя. Толькі што вярнуліся групы студэнтаў з універсітэта Нові Сад (Сербія) і Обнінскага інстытута атамнай энергетыкі (РФ). Зараз наступныя групы студэнтаў накіроўваюцца ў навучальныя ўстановы Балгарыі.

***– Калі інстытут міжнародны, значыць, і мовы тут вывучаюцца на павышаным узроўні?***

– Безумоўна. Студэнты абавязкова ў межах навучальнага працэсу вывучаюць дзве замежныя мовы: англійскую і яшчэ адну па выбары. Прычым другая мова ідзе не ў рамках нейкага факультатыва, а прапісана ў вучэбным плане. Робіцца ўсё, каб выпускнікі свабодна валодалі замежнымі мовамі.

***– «Медыцынская фізіка», «медыцынская экалогія»... Гэтыя спецыяльнасці амаль экзатычныя. Дзе могуць працаваць будучыя прафесіяналы?***

– Спецыяльнасць «медыцынская фізіка» ў асноўным арыентавана на працу ў медыцынскіх установах. Па дадзенай спецыяльнасці яшчэ выпуску не было. Гэту прафесію атрымаць пакуль што можна толькі ў нас. І зараз адкрываецца двухгадовая магістратура.

У апошні час вельмі хутка ўдасканальваюцца медыцынскія апараты і тэхналогіі дыягнастычнага і лячэбнага накірункаў. Выкарыстоўваецца сур'ёзная тэхніка, якая патрабуе вельмі прафесійнага абыходжання. І вельмі часта ўзнікае неабходнасць кансультацыі як для інтэрпрэтацыі нейкіх вынікаў, так і для забеспячэння эксплуатацыі ўсіх магчымасцяў сучаснай апаратуры. Для гэтага нашы студэнты вывучаюць фізіку, а таксама прадметы медыцынскага профілю.

Выпускнікі спецыяльнасці «медыцынская экалогія» патрэбны на прадпрыемствах і ва ўстановах аховы здароўя. Гэта праца ў цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі, завадскіх, вытворчых і навукова-даследчых лабараторыях, дзе нашы спецыялісты ў якасці біёлагаў-экспертаў дапамагаюць лекарам выконваць біялагічныя даследаванні, займаючыся аналізам біялагічных матэрыялаў, маніторынгам навакольнага асяроддзя.

***– А за мяжой такія спецыяльнасці наогул ёсць?***

– Медыцынская фізіка з'явілася як спецыяльнасць у Еўропе толькі гадоў 10 таму. Апошнім часам яна атрымала распаўсюджанне і ў Расіі. Можна сказаць, што гэта адна з самых запатрабаваных спецыяльнасцяў сучаснасці і будучыні, якая звязана з вельмі хуткім развіццём тэхналогій аховы здароўя. Паняцце «ядзерная медыцына» шырока выкарыстоўваецца. Цэнтры ядзернай медыцыны ўжо працуюць ў розных краінах. Сучасны цэнтр ядзернай медыцыны будуецца ў Мінску, таму ёсць рэальная запатрабаванасць фізікаў у медыцыне. Адсюль і вельмі сур'ёзнае стаўленне да гэтай спецыяльнасці.

***– Бачна, што МДЭІ актыўна выступае на міжнароднай сцэне. Чым яшчэ ганарыцца ўніверсітэт?***

– Нашы спецыялісты і выкладчыкі прымалі самы непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы заканадаўчых актаў і кадраў для аднаўляльнай энергетыкі, звязанай з выкарыстаннем энергіі сонца, ветру, біяэнергетыкі. У тым ліку, дзякуючы нашаму інстытуту, з'явіліся цэнтры экалагічнай адукацыі.

Заўсёды ў нашай навучальнай установе працавалі і працуюць спецыялісты, якія прафесійна займаюцца рознымі пытаннямі аховы навакольнага ассяроддзя, фарміруюць адпаведны светапогляд у грамадстве.

**Гутарыла**
**Таццяна МОРАВА**

ПРАЕКТЫ

# Навукоўцы канстатуюць нармалізацыю дыялогу Беларусі і ЕС

Другая міжнародная канферэнцыя «Еўрапейскі саюз і Рэспубліка Беларусь: перспектывы ўзаемадзеяння», прайшла 2 чэрвеня пад эгідай Цэнтра даследаванняў Жана Манэ БДУ.

Першая канферэнцыя прайшла ў 2014 годзе. Сёлета мерапрыемства адкрылі рэктар акадэмік ***Сяргей Абламейка***, кіраўнік аддзела палітыкі, прэсы і інфармацыі Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі ***Джым Казенс*** і кіраўнік упраўлення агульнаеўрапейскага ўзаемадзеяння Міністэрства замежных спраў нашай краіны ***Дзяніс Сідарэнка***. Апошні, у прыватнасці, адзначыў, што з-за пагрозы тэрарызму, наркатрафіку, гандлю людзьмі Беларусь мае патрэбу ў шчыльным супрацоўніцтве з усімі суседзямі, у тым ліку і з Еўрапейскім саюзам. Але важна разумець безгрунтоўнасць падыходу да нашай краіны «або вы з намі, або супраць нас». «Мы хочам прайсці гэты шлях пабудовы адносін з двума вялікімі суседзямі, знайшоўшы такі баланс узаемадзеяння, які стане прыкладам для іншых краін рэгіёна, пакажа магчымасць паспяховага пазіцыянавання», – адзначыў дыпламат.

«Папярэдняя канферэнцыя, – распавёў нам кіраўнік Цэнтра даследаванняў Жана Манэ БДУ ***Уладзімір Астапенка***, – праводзілася ў зусім іншых палітычных умовах. Тады пра актыўныя дзеянні з Еўрапейскім саюзам мы нават не размаўлялі. У лютым былі знятыя санкцыі, і пачалася нармалізацыя дыялогу. Таму канферэнцыя асабліва дарэчная, каб прагледзець усе аспекты ўзаемаадносін з Еўрапейскім саюзам і зрабіць практычныя рэкамендацыі. Думаю, што гэта не апошняя канферэнцыя, бо акадэмічная цікавасць да гэтай тэмы не згасае».

Эксперты ў галіне еўрапейскай інтэграцыі з Беларусі, Казахстана, Расіі, а таксама Вялікабрытаніі, Бельгіі і Польшчы абмеркавалі пытанні знешняй палітыкі, сацыяльна-эканамічнага развіцця, прававога рэгулявання, развіцця супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы.

На канферэнцыю былі запрошаныя прадстаўнікі беларускіх і замежных ВНУ. Ад БДУ на пленарным пасяджэнні выступіў загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта ***Рыгор Васілевіч***. Ён распавёў пра гісторыю і сучаснасць Беларусі як сацыяльнай дзяржавы і параўнаў асноўны закон нашай краіны з ірландскай і іспанскай канстытуцыямі. Прадставіць вопыт узаемаадносін Казахстана і ЕС з Астаны прыляцела дырэктар Інстытута прававых даследаванняў Казахскага дзяржаўнага юрыдычнага ўніверсітэта ***Сара Ідрышава***. Адлігу паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю канстатаваў прафесар ***Стывен Блокманс*** з Цэнтра даследаванняў еўрапейскай палітыкі (Бельгія). Скончыў шэраг пленарных дакладаў суддзя Суда ЕАЭС ***Дзяніс Колас***. Дыялог працягнулі на ФМА ў межах чатырох секцый: «Знешняя палітыка ЕС», «Сацыяльна-эканамічная палітыка ЕС», «Прававое рэгуляванне ў ЕС», «Супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы ў ЕС». Будзе апублікаваны зборнік тэзісаў.

Канферэнцыя ладзіцца па праекце імя Жана Манэ, які быў галоўным ідэолагам еўрапейскай інтэграцыі. З 2001 г. праект распаўсюдзіўся па ўсім свеце і зараз ахапіў 68 краін на пяці кантынентах. Яго мэта – падтрымаць вывучэнне еўрапейскага права і еўрапейскай інтэграцыі праз вылучэнне грантаў даследчыкам і выкладчыкам ВНУ.

**Віталь АРЭШКА**

АБ'ЯВЫ

**ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ бізнес-адміністравання,

ПРАФЕСАРА кафедры лагістыкі,

ДАЦЭНТЫ кафедраў бізнес-адміністравання, бізнес-камунікацый, лагістыкі, менеджменту тэхналогій, інавацыйнага кіравання,

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедраў бізнес-адміністравання, лагістыкі, менеджменту тэхналогій, інавацыйнага кіравання,

ВЫКЛАДЧЫКА кафедры бізнес-камунікацый.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 5, каб. 210, тэл. 2007863.*

*E-mail: oopruk@sbmt.by, www.sbmt.by.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Пра XXII міжнародныя Кірыла-Мяфодзьеўскія чытанні БДУ** – soyuz.by (17.05), rumol.org (24.05).

**Выстава прац скульптара Аляксандра Батвінёнка прайшла ў БДУ** – megacat.by (26.05), minsknews.by (30.05), БТ-1 (06.06).

**Двухгадовая магістратура на англійскай мове па спецыяльнасці «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі»** – sputnik.by (31.05), АНТ (11.06), БелТА, Tut.by (26.05).

**Пра вынікі ўступнай кампаніі–2016 ў Ліцэй БДУ** – interfax.by, sputnik.by, minsknews.by (01.06), zviazda.by, «Звязда» (02.06).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Вязынка – 2016: феерыя паэзіі, натхнення, маладосці





*Дэканы Віктар Шадурскі, Вадзім Гігін, Сяргей Балашэнка і Сяргей Ходзін чытаюць купалаўскую «Спадчыну»*

Май. 1976 год. Цудоўнае надвор'е. Па вуліцах Мінска крочыць грамада вясёлых, бадзёрых маладых людзей. Відавочна, што яны захопленыя нейкай сумеснай дзейнасцю, бо на іх тварах ззяюць усмешкі, іх вочы гараць. «А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе?» Студэнты філфака БДУ! Яны збіраюцца ў Вязынку, на радзіму песняра Беларусі – Янкі Купалы, каб ушанаваць яго памяць, а таксама файна правесці час сярод сяброў, надыхацца духмяным паветрам і палюбавацца прыгожымі краявідамі.

Мінула шмат гадоў. Многае змянілася, але і сёння Вязынка – феерыя паэзіі, натхнення, маладосці, і так жа, як і раней, яна прыцягвае ўвагу і філолагаў, і студэнтаў іншых факультэтаў БДУ.

Вязынка штогод збірае вялікую колькасць філфакаўцаў і іх сяброў. Вось і сёлета 21 мая ў вёсачцы пад Маладзечнам стаяў вясёлы гоман. Акрамя студэнтаў філфака, мерапрыемства наведалі навучэнцы гістфака, юрфака, геафака, хімфака, ФМА, ФФСН. Удзельнікамі «Вязынкі – 2016» сталі і іх дэканы. Упершыню ў госці да філолагаў у Вязынку завіталі курсанты ваеннага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.

Свята традыцыйна пачалося з выканання студэнтамі гімна Haudeamus. Пасля на імправізаваную сцэну ля хаты Янкі Купалы выйшлі бадзёрыя вядучыя – Вікторыя Міхеенкава і Раман Бабак паведамілі, што сёлетняя Вязынка сімвалічная па многіх прычынах. Па-першае, 2016 год абвешчаны «Годам культуры» ў Беларусі. Па-другое, сёлета адзначаецца 95-годдзе з дня заснавання БДУ. Па-трэцяе, год знамянальны яшчэ і двайным юбілеем самой Вязынкі: першы злёт студэнтаў-філолагаў адбыўся на радзіме песняра ў 1976 годзе, а ў 2006 годзе адроджаная акцыя набыла статус агульнаўніверсітэцкай. Больш за тое, 100 гадоў таму Янка Купала ўзяў шлюб з Уладзіславай Станкевіч, якая стала яго вернай спадарожніцай на ўсё жыццё.

Павіталі ўдзельнікаў мерапрыемства піянеры і ветэраны «вязынкаўскага руху» старшыня міжнароднага фонду імя Янкі Купалы, вядучы купалазнаўца, прафесар *Вячаслаў Рагойша* і дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ *Уладзімір Кароткі*. Яны аддалі даніну памяці беларускаму песняру, падкрэсліў значэнне яго дзейнасці для развіцця не толькі нацыянальнай культуры, але і менталітэту беларусаў, а таксама падзяліліся ўласнымі ўспамінамі пра ранейшыя Вязынкі і пажадалі юнакам і дзяўчатам і далей прыязджаць на радзіму Янкі Купалы, каб адпачыць душой і целам.

Павітаў удзельнікаў мерапрыемства прарэктар БДУ па навуковай рабоце *Васіль Сафонаў*. Дэканы юрыдычнага, гістарычнага факультэтаў, факультэта міжнародных адносін і факультэта філасофіі і сацыяльных навук выказалі захапленне каларытам Вязынкі і зачыталі супольна знакаміты купалаўскі верш «Спадчына».

Распачаўся канцэрт. На сцэну выходзілі студэнты філалагічнага факультэта і прадстаўлялі свае творчыя нумары – вершы, песні. Курсанты Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі ўразілі прысутных сваім баявым мастацтвам. Сапраўдны фурор выклікалі выступленні нашых замежных сяброў. Студэнты з Туркменістана пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры англійскага мовазнаўства *Марыяны Груздзіловіч* выканалі беларускія народныя песні «Позірк дзявочы» і «Кацілася чорная галка». Навучэнцы з Кітая парадавалі гледачоў пранікнёным выкананнем знакамітага твора ансамбля «Песняры» – «Белавежская пушча», а таксама прадставілі танец «Удзячнае сэрца», прысвечаны Беларусі і БДУ.

Пасля канцэрта ўсе рушылі да помніка Янку Купалу, дзе адбылося ўскладанне кветак. А затым «вязынкаўцы» дружна пакрочылі на «гару Парнас», дзе іх ужо чакала насычаная праграма – турсцяжына, пенальці дэкану, валейбол і іншыя цікавосткі, а таксама смачная «каша ад рэктара».

Удзельнікі свята вярталіся дадому з новымі сіламі, узрушаныя і задаволеныя. Гэта не дзіўна, бо сама атмасфера Вязынкі прасякнута духам паэзіі, абуджае да творчасці. Маляўнічыя краявіды, у якія быў улюбёны Янка Купала, не могуць пакінуць абыякавымі маладых і натхнёных спадчыннікаў пісьменніка. Хто ведае, можа, пасля Вязынкі беларуская літаратурная скарбонка папоўніцца новымі імёнамі?..

**Надзея ДЗЯМІДКА**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Падрабязнасці, фота і відэа **gazeta.bsu.by**

# «Студэнцкі лідар: жыццё навідавоку»

**Паняцце лідарства ў БДУ актуальнае заўсёды. І пачынаецца яно са студэнцкага самакіравання.**

Бо ўніверсітэт – гэта першае ўсвядомленае месца самавыяўлення, пошукаў сваёй ролі ў камандзе і рэалізацыі ідэй. Чым больш гэтых ідэй, тым большую колькасць людзей хочацца пацягнуць за сабой, каб усё паспець. І тут трэба памятаць: быць лідарам – гэта ў першую чаргу вялікая адказнасць, а ўжо потым павага і радасць перамог.

Для тых, хто быў гатовы ўзяць адказнасць за сваю каманду і эфектыўна выкарыстоўваць студэнцкі час на карысць універсітэта, пагрузіцца ў плённую і цікавую вучобу з прафесійнымі трэнерамі і спікерамі, узімку стартавала школа актыву БДУ «Студэнцкі лідар: жыццё навідавоку». Упершыню фармат навучання студэнцкага актыву склаў цэлыя тры месяцы.

На адкрыцці школы рэктар *Сяргей Абламейка* адзначыў: «Раней мы заўважалі лідараў на 4–5 курсах, цяпер усё хутка змяняецца, і мы абавязаны знайсці вас ужо на першым-другім, у тым ліку і ў сувязі з пераходам на 4-гадовае навучанне». Прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Сувораў нагадаў, што ацэнка эфектыўнай працы заснавана не толькі на ўдасканаленні сябе як лідара, але і на выніковасці працы ўсёй каманды.

Кожныя два тыдні, а ў апошні месяц і кожны тыдзень з прычыны з'яўлення новых тэм і запрашэння спікераў выступіць яшчэ і яшчэ раз, нашы вучні ўсмоктвалі веды па сапраўды прадуманай праграме школы актыву БДУ. 16 спікераў, прафесіяналаў сваёй справы ў сферах маркетынгу, кіравання персаналам, фандрэйзінгу, асобаснага росту, кіравання праектамі, коўчынгу і шматлікага іншага далі пэўныя парады, правераныя методыкі і падзяліліся сваім досведам з нашымі навучэнцамі. Гэтыя тэмы былі аб'яднаны ў тры блокі: праца над сабой, усведамленне сябе як лідара і праца з лідарскімі якасцямі; дынаміка развіцця каманды і вывучэнне ўнутраных працэсаў ад станаўлення да функцыянавання групы як адзінага механізму; вывучэнне карысных прылад і эфектыўных падыходаў да дасягнення вынікаў у камандзе.

25 студэнтаў 1–3 курсаў былі абраны для навучання па матывацыйных лістах. Адной з умоў адбору была наяўнасць сваёй каманды, у якой і меркавалася замацаванне атрыманых ведаў: навучальныя групы, універсітэцкія аб'яднанні, арганізацыі. Да кожнага ўдзельніка школы актыву быў прыстаўлены ментар з упраўлення выхаваўчай працы з моладдзю, задачай якога было дапамагаць сваім падапечным у дасягненні іх лідарскіх мэт. А ў адмысловых дзённіках студэнты маглі адзначаць свае поспехі, планаваць далейшую працу са сваёй камандай і канспектаваць атрыманыя падчас трэнінгаў веды.

Для тых, хто не патрапіў у першы набор школы актыву БДУ, выпускаліся відэадзённікі і напаўняліся карыснымі матэрыяламі сацыяльныя сеткі (vk.com/leaderbsu).

Усе тры месяцы праляцелі хутка, студэнты атрымалі веды па прамоўніцкім майстэрстве, мэтапакладанні, тайм-менеджменце, камандаўтварэнні, кіраванні стрэсам, дэлегаванні паўнамоцтваў і шмат чым іншым. Заняткі праходзілі заўсёды жыва і з элементамі інтэрактыву.

Па выніковым апытанні 84 % удзельнікаў адзначылі станоўчыя змены ў жыцці за 3 месяцы навучання ў школе актыву БДУ, 80 % гэтыя змены звязваюць з вынікамі ўдзелу ў школе актыву. У 80 % з'явіліся новыя мэты ў жыцці. І 96 % адзначылі важнасць і неабходнасць такіх праектаў у будучыні.

Хтосьці са студэнтаў за гэты час падняў свой прафесійны ўзровень і стаў старшынёй моладзевай арганізацыі свайго факультэта, хтосьці прыцягнуў увагу студэнтаў і супрацоўнікаў да адкрыцця новага кірунку ў спорце і прадстаўлення БДУ на найбліжэйшай універсіядзе ў гэтым відзе спорту. Удзельнікі адзначылі з'яўленне большай упэўненасці і матывацыі да дасягнення ранейшых і, што немалаважна, новых мэт у жыцці. Бо самая галоўная перамога – перамога над сабой, самае галоўнае параўнанне – параўнанне сябе сучаснага з сабой у мінулым.

Задача школы актыву БДУ – выявіць, навучыць і даць усе ўмовы для станаўлення лідараў, гатовых з бляскам у вачах і верай у душы стварыць новае, яшчэ лепшае ў родным універсітэце, працягваючы паважаць традыцыі. Менавіта такіх выпускнікоў школа актыву БДУ атрымала ў выніку. Будзем чакаць поспехаў нашых выпускнікоў.

**Водгукі ўдзельнікаў**

**Архіпенка Аляксандра,** ФРКТ, 1 курс: «Зараз я навучылася планаваць час, умею лепш разбірацца ў людзях і ўвасабляць свае ідэі!»

**Несцяронак Глеб,** ФПМІ, 1 курс: «Мне ўдалося стварыць пазітыўную атмасферу ў сваёй навучальнай групе, дапамагчы аднагрупнікам стаць лепшымі».

**Краўчанка Вольга,** ДІКСТ, 2 курс: «Пасля школы актыву я пераасэнсавала сваё жыццё, стала ставіць мэты і імкнуцца іх дасягаць!»

**Заблоцкая Лідзія,** Інстытут журналістыкі, 1 курс: «У савецке старастаў мы прыдумалі некалькі цікавых праектаў, знайшлі шлях іх рэалізацыі. Я хачу зрабіць свой унёсак у паспяховае развіццё нашага самакіравання».

**Наталля КАПАЦЭВІЧ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

16 чэрвеня 2016 года
Падпісана да друку 15.06.2016 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*